тэматыцы і праблематыцы. Па сутнасці, як сведчаць самі тэксты, прыпеўкі – гэта той малы фальклорны жанр, які закранае ўсе сферы жыцця, чуйна рэагуе на розныя праявы ў ім, станоўчыя і негатыўныя, выразна і эмацыянальна, дакладна і псіхалагічна глыбока перадае пачуцці чалавека.

**Спіс літаратуры**


1 Прыпеўкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі; муз. частка Л. М. Фёдарава; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 432 с.

2 Беларусы. Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі і інш.; рэдкал.: В. М. Белявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 586 с.


*УДК 398.33:398.432(476.2)*


**Д. А. Несцярэнка**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***


## АБРАД ВАДЖЭННЯ РУСАЛКІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ)


*У артыкуле, падрыхтаваным на аснове аўтэнтычных запісаў пра русальны абрад, зробленых студэнтамі і выкладчыкамі ГДУ імя Ф. Скарыны, прыведзены цікавыя прыклады абрадавых дзеянняў і песень, звязаных з міфалагічным персанажам – русалкай. Аўтарам прааналізаваны асаблівасці бытавання гэтай абрадавай з'явы на тэрыторыі Добрушскага раёна, вылучаны адметныя рысы выканання абраду ў асобных вёсках.*


Абрад ваджэння русалкі – адзін з самых цікавых веснавых абрадаў, звесткі пра які былі запісаны студэнтамі і выкладчыкамі УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны» на працягу шматлікіх гадоў у палявых экспедыцыях на тэрыторыі розных раёнаў Гомельскай вобласці і апублікаваны ў кнізе Валянціны Новак «На гранай нядзелі русалкі сядзелі» [1]. Засяродзім увагу на мясцовых асаблівасцях гэтага абраду, які выконвалі ў Добрушскім раёне Гомельскай вобласці. Варта адзначыць, што звесткі, запісаныя пра ваджэнне русалкі ў вёсках Баршчоўка, Кругавец-Калініна, Леніна, Насовічы, Перарост, Чырвоная Буда, Чырвоны Партызан, Усохская



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Буда, сведчаць пра добры стан захавання русальнай традыцыі на Добрушчыне.

Аснову абраду складаюць міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з персанажам ніжэйшай міфалогіі – русалкай. «Уяўленні беларусаў пра русалак цесна звязаны з вераваннямі, песнямі і абрадамі Русальнага тыдня, які ў народным календары знаходзіцца паміж Сёмухай і Купаллем: іншымі словамі, прыпадае на канец вясны – пачатак лета» [2, с. 114].

Ва ўспрыманні продкаў-язычнікаў русалкі былі тымі духамі, месцам знаходжання якіх была вада. Да нашых дзён беларусы зберагглі, з аднаго боку, павагу да русалак як да апекуноў воднай прасторы і істот, якія садзейнічаюць ураджайнасці, а з другога боку, іх асцерагаліся з прычыны таго, што яны маглі нашкодзіць чалавеку, напрыклад, зачараваць мужчыну або прывабіць дзяўчыну, а потым захапіць іх з сабою ў ваду. Варта адзначыць, што, калі людзі бачылі нешта падобнае на русалку, у іх не ўзнікала ніякіх сумненняў адносна гэтай істоты, бо, паводле народных уяўленняў, яе знешні выгляд быў прыкладна аднолькавым у розных лакальных традыцыях: балотна-зялёныя валасы, хвост, як у рыбы, злы характар і нядобразычлівыя намеры.

Фактычны матэрыял, звязаны непасрэдна з апісаннямі міфалагічнага персанажа (русалкі), дазволіў вылучыць дзве версіі наконт паходжання гэтага персанажа: «Паводле адной з іх, найбольш распаўсюджанай, русалкамі маглі стаць прыгожыя дзяўчаты, якія утапіліся <…> . Згодна з другой версіяй, русалкамі станавіліся дзеці, памёршыя нехрышчонымі» [3, с. 196]. У кожнай з вёсак Добрушскага раёна назіраліся адметныя мясцовыя рысы ў абрадзе ваджэння русалкі. Напрыклад, у в. Баршчоўка выкананне гэтага абраду было абумоўлена адсутнасцю дажджу. Самі інфарманты падкрэслілі гэты факт: «Глядзім жа, лета сухое, няма дажджу. Нада, значыць, на Траецкай нядзелі весці русалку. Як добрае лета, ё дождж, мы русалкі не вядом…» (в. Баршчоўка) [1, с. 148]. У іншых вёсках, напрыклад, у в. Чырвоная Буда мясцовыя жыхары адразу ж падкрэслівалі, што вадзілі русалку, каб забяспечыць добры ўраджай зерневых культур: «Жанчыну пераадзявалі: карсеткі, вышываная рубашка, любісцік, крапіва. Затым яе вялі па сялу, выводзілі на ярыну, у поле. Там знімалі ўсё з яе і лажылі на поле. У гэтым удзельнічалі ўсе людзі сяла. Гэта праводзілі на ўраджай» [1, с. 157].

Варта адзначыць такі важны момант, звязаны з абрадам «Провады русалкі», як прасторавы аспект. Як правіла, вадзілі русалку ў накірунку з захаду на ўсход, што падцвярджаюць жыхары: «Ваабшчэ водзяць у нас русалку з захаду вёскі на ўсход, у край сяла»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(в. Баршчоўка) [1, с. 148]; «Ішлі з аднаго края сяла ў другі. Звычайна пачыналі з захаду і ішлі на ўсход» [1, с. 149]. Калі праводзілі русалку, то ішлі па вуліцы праз усю вёску і выковалі песню:

*На граной нядзелі русалкі сядзелі.*
*У саду, у саду пад ігрушаю*
*Там стучыць, гручыць,*
*Муж жану вучыць* (в. Баршчоўка) [1, с. 151].

У в. Чырвоная Буда, калі выконвалі абрад ваджэння русалкі, то спявалі песню, у якой знайшлі паслядоўнае адлюстраванне дзеянні ўдзельнікаў гэтай абрадавай цырымоніі:

*На граной нядзелі*
*Русалкі сядзелі.*
*Там русалкі сядзелі,*
*У жыце зялёнам сядзелі.*
*Вывелі русалку*
*У ядраное жыта,*
*У ядраном жыце*
*Русалцы жыці* [1, с. 152].

Семантыка дзеянняў, звязаных з русалкай, была скіравана на забеспячэнне добрага ўраджаю жыта. Варта заўважыць, што ў вёсках Добрушскага раёна русалку звычайна вадзілі менавіта ў жыта. Матыў спрыяння русалкі пладавітасці нівы характэрны для многіх варыянтаў русальных песень:

*Русалка ўстала,*
*А ў гародзе лабада стала,*
*Русалку дамоў адвядзём,*
*Самі на гарод пойдзем.*
*Там траву мы будзем рваць,*
*Ад русалкі ўцякаць.*
*Нас, русалка, не пужай,*
*Мы прыйшлі на ўраджай.*
*Будзе жыта выспяваць,*
*А мы русалку апяваць* (в. Кругавец-Калініна) [1, с. 153].

Сустракаюцца розныя сведчанні інфармантаў адносна выбару або маладой, або старой жанчыны на ролю русалкі. Калі ў в. Кругавец-Калініна выбіралі маладую жанчыну і ўпрыгожвалі яе кветкамі і жытам («Выбіралі маладую жанчыну, каб была добрая, не стыдлівая, каб умела павесці за сабой, запець».) [1, с. 152], то ў в. Лук’янаўка русалкай была жанчына ва ўзросце («Русалкай выбіралі старую жанчыну») [1, с. 154]. Паводле ўспамінаў інфармантаў, іншы раз русалка павінна была скакаць праз раскладзены касцёр, пасля чаго з яе «веткі знімалі і забіралі, каб у свой агарод паўтыкаць. <…> Веткі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўтыкалі ў агародзе, штоб быў харошы ўраджай і мядведка не паела пасеянае» (в. Лук'янаўка) [1, с. 154].

У в. Усохская Буда абрад праводзін русалкі меў спецыфічныя адметныя рысы: сустракаліся два гурты за вёскай, якія ішлі з розных бакоў вёсак насустрач адзін аднаму: «Усё сяло праводзіць. А з другога, суседняга сяла, тожа вядуць. І за сялом патом ужэ стракаюцца» [1, с. 159]. Як і ў іншых вёсках, у в. Усохская Буда таксама забіралі зеляніну, у якую ўбіралі русалку, і неслі на агароды, каб засцерагчы іх ад мядзведкі: «Галлё тое, што з русалак рвалі, забіраюць жанчыны сабе. Тады ставяць на гарод, шоб не елі мядзведкі, шоб расло ўсё добра» [1, с. 159]. Калі выконвалі абрад праводзін русалкі, то песні ў гэтай вёсцы спявалі «каля кожнага двара, дзе сядзелі людзі» [1, с. 161], а русалка павінна была ўсім кланяцца:

*На граной нядзелі русалкі сядзелі,*
*Ой, рана, рана, русалкі сядзелі.*
*Русалкі сядзелі, на дзевак глядзелі,*
*Ой рана, рана, на дзевак глядзелі.*
*Дзевачкі-сястрычкі, дайце мне спаднічкі,*
*Ой рана, рана, дайце мне спаднічкі.*
*Хлопчыкі-браточкі, дайце мне сарочкі* (в. Усохская Буда) [1, с. 161].

Звычайна ў в. Усохская Буда месцам, куды праводзілі русалку, з'яўлялася рэчка: «После, кагда русалку прівадзілі в другі канец дзярэўні, её раздзявалі і праганялі в рэчку» [1, с. 160].

З мэтай засцярогі ад шкоднага ўздзеяння русалак выкарыстоўвалі розныя прадметныя атрыбуты, напрыклад, крапіву: «Калі даходзяць да жыта, яе там астаўляюць, а самі цікаюць у дзярэўню. Русалка жа даганяе іх: і каго дагоне, то б'е крапівай» (в. Чырвоны Партызан) [1, с. 157].

Такім чынам, абрад ваджэння русалкі, звесткі пра які былі сістэматызаваны даследчыцай В. С. Новак, сведчаць пра багаты мясцовы каларыт гэтай унікальнай абрадавай з'явы на тэрыторыі Добрушскага раёна.

**Спіс літаратуры**

1 Новак, В. С. На гранай нядзелі русалкі сядзелі… / В. С. Новак. – Гомель: "Барк", 2005. – 244 с.

2 Лакальна-рэгіянальныя парадыгмы беларускага фальклору: вучэб.-метад.дапам.: у 3 ч. Ч. 3. Песні "Стралы". Русальныя песні / Р. М. Кавалёва [і інш.]; пад агул. рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск: БДУ, 2015. – 155 с.

3 Беларуская міфалогія. Хрэстаматыя: вучэб. дапаможнік / уклад. В. С. Новак. – Мінск: РІВШ, 2013. – 394 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ